# СКАЧОК АЙЧЫННАЙ ХІРУРГІІ

**Пратэзаванне трахеі з выкарыстаннем тканкаінжынернага пратэза — так называецца ўнікальная аперацыя, якую выканалі ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Анатолю Хлапкову з Рагачова. Адчувае сябе пацыент добра і літаральна на наступным тыдні адпраўляецца дадому.**



Фота БЕЛТА.

Беларускія медыкі першымі ў свеце дасягнулі станоўчага выніку пры выкананні падобнага аперацыйнага ўмяшання. Для гэтага давялося задзейнічаць велізарную колькасць самых розных спецыялістаў і найноўшыя тэхналогіі. Паводле слоў **дырэктара цэнтра Алега СУКОНКІ**, адной з нявырашаных праблем сучаснай медыцыны застаецца лячэнне пацыентаў з захворваннямі трахеі і галоўных бронхаў, што суправаджаецца звужэннем іх прасвету. Сустракацца гэта можа пры пухлінах лёгкага, што і мела месца ў праапераванага пацыента.

У свеце існуе некалькі падыходаў да пратэзавання трахеі, і кожны звязаны з высокай рызыкай развіцця ўскладненняў і гібелі. Няўдалыя спробы хірургічнага ўмяшання выконваліся ў Расіі, Іспаніі, Бельгіі, Англіі, ЗША. На думку беларускіх спецыялістаў, найбольш перспектыўным кірункам з'яўляецца выкарыстанне пратэзаў на аснове донарскай трахеі, адмытай ад клетак і заселенай уласнымі клеткамі рэцыпіента. Пры гэтым на адным з этапаў ачышчаная донарская трахея ўжыўляецца ў мышцу жывата рэцыпіента — для паляпшэння ўмоў сілкавання клетак, што імплантуюцца. Гэты этап значна паляпшае прагноз. Першы праапераваны менавіта такім чынам пацыент назіраецца ва ўрачоў ужо тры месяцы. Ніякіх прыкмет прагрэсавання захворвання, функцыянальнай недастатковасці ў яго няма.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## УЛАДА НА СУВЯЗІ

**Традыцыйна Мінгарвыканкам і аблвыканкамы праводзяць 16 ліпеня «прамыя лініі» з 9.00 да 12.00.**

**У гэту суботу на прамой сувязі з насельніцтвам будуць:**

Намеснік старшыні **БРЭСЦКАГА аблвыканкама САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч.** Тэл. 8 (016) 2213121

Намеснік старшыні **ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама АСКЕРКА Віктар Віталевіч.** Тэл. 8 (021) 2222222

Старшыня **ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч.** Тэл. 8 (023) 2751237

Намеснік старшыні **ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч.** Тэл. 8 (015) 2735644

Намеснік старшыні **МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч.** Тэл. 8 (022) 2501869

Намеснік старшыні **МІНСКАГА аблвыканкама НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч.** Тэл. 8 (017) 5004160

Намеснік старшыні **МІНСКАГА гарвыканкама ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч.** Тэл. 8 (017) 2224444.

■ Адпачнём

# ЭКАНОМІЯ — СЕМ РУБЛЁЎ У ДЗЕНЬ

### На восень айчынныя санаторыі прапануюць пуцёўкі са зніжкай

**Цэны на аздараўленчыя паслугі за год выраслі прыкладна на 18 працэнтаў. Калі летась дзень пражывання ў стандартным нумары санаторыя ў самы пікавы перыяд абыходзіўся ў 41 рубель (ці 410 тысяч да дэнамінацыі) на чалавека, то цяпер — у 48,5 рубля. Але на восеньскія месяцы ўжо прадугледжана сістэма зніжак. Хутчэй за ўсё цэны на гэты час упадуць да 41 рубля за суткі.**

### ПАПУЛЯРНЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ ЛАГЕРЫ

Кошты пуцёвак у дзіцячыя аздараўленчыя лагеры аказаліся ніжэйшымі, чым прагназавалася.

— Гэта дасягнута таму, што пастаўкі тых жа прадуктаў, напрыклад, ажыццяўляюцца ад прамых вытворцаў, — патлумачыў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

Так, адправіць дзіця на 18 дзён у кругласутачны летнік абыдзецца ў сярэднім у 378 рублёў (да дэнамінацыі — 3 мільёны 780 тысяч) пры планаваным кошце ў 385 рублёў. Пуцёўка ў дзённы лагер па факце выйшла таннейшай на 20 рублёў: набыць яе можна за 84,5 рубля. На 10 рублёў паменшаў кошт знаходжання ў лагеры працы і адпачынку і склаў 90 рублёў за змену. Звяртаем увагу, што тут указаны поўныя цэны. Бацькі ж, набываючы пуцёўкі для сваіх малых, могуць разлічваць на пэўныя датацыі і ў выніку заплаціць значна меншую суму.

За першую і другую змены ў летніках аздаравіліся больш за 286 тысяч дзяцей. З іх 94 тысячы пабывалі ў кругласутачных лагерах, 192 тысячы — у дзённых. 56 тысяч дзяцей наведвалі спартыўна-аздараўленчыя лагеры, 31 тысяча — профільныя, каля 14 тысяч — лагеры працы і адпачынку. Апошнія, трэба сказаць, становяцца ўсё больш папулярнымі сярод падлеткаў.

— Лагеры працы і адпачынку дзейнічаюць ужо чацвёрты год, і іх колькасць расце, — кажа Генадзь Балбатоўскі. — Напачатку нас крытыкавалі, быццам дзяцей прымусова будуць заганяць туды працаваць. Але асцярога скептыкаў не апраўдалася. Сёння гэтая форма адпачынку вельмі запатрабавана. Падлеткі зарабляюць там грошы, набываюць навыкі. Мы нават не можам прыняць усіх ахвотных, дзеці просяцца на другую змену.

### ПЯЦІЗОРКАВЫЯ САНАТОРЫІ І SPA-САЛОНЫ

Сёння айчынныя санаторыі цалкам запоўнены. І на аздараўленне туды едуць не толькі беларусы. За першае паўгоддзе ў санаторыях спыніліся больш за 95 тысяч замежнікаў (на 16 тысяч больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года). Як і раней, асноўная частка — расіяне. Іх доля хоць крыху і зменшылася, але ўсё роўна складае 80—90 працэнтаў ад усіх грамадзян іншых краін.

Разам з тым актыўней сталі прыязджаць да нас жыхары Заходняй Еўропы: палякі, немцы. Напрыклад, экспарт аздараўленчых паслуг па Гродзенскай вобласці за першае паўгоддзе вырас у тры разы.

— Брэндам беларускіх санаторыяў застаецца медыцынскі складнік. Але замежнікі заходняга рэгіёна хочуць ехаць на зразумелы для іх від паслуг — звычайна гэта SPA. Санаторна-курортныя арганізацыі сёння працуюць над развіццём гэтага рынку, і ў нас ужо ёсць паўнавартасныя сертыфікаваныя SPA-салоны, якія адпавядаць міжнародным стандартам, — адзначае Генадзь Балбатоўскі.

Клапоцяцца ў айчынных здраўніцах і пра тое, каб стварыць больш камфортныя ўмовы пражывання. Напрыклад, пры рэканструкцыі перарабляюць чатырохмесныя нумары ў адна- і двухмесныя. Летась амаль чвэрць выручкі ад рэалізацыі паслуг — каля 70 мільёнаў (700 мільярдаў недэнамінаваных рублёў) — уласнікі санаторыяў уклалі ў развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы. А каб прывучыць абслугоўваць персанал быць больш ветлівым, актыўна накіроўваюць пакаёвак і афіцыянтаў на курсы гасціннасці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Дзяржава і бізнес

# АДЗІНЫ ПАДАТАК — ДОБРААХВОТНА

**У сталіцы адбылося дзявятае пасяджэнне рабочай групы па пытаннях дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў пры грамадска-кансультацыйным (экспертным) савеце па развіцці прадпрымальніцтва пры Міністэрстве эканомікі. Яно праходзіла пад старшынствам намесніка міністра эканомікі Ірыны КАСЦЕВІЧ. На пасяджэнні былі абмеркаваны практычныя пытанні, якія тычацца выплаты ўзносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) і асаблівасцяў разліку пенсій, назначэння дапамогі ІП.**

Прадстаўнікі прадпрымальніцкага асяроддзя выступілі з прапановай, якую можна назваць «не працуеш — не плаціш». Гаворка ідзе пра тое, каб прадпрымальнік — плацельшчык адзінага падатку ў выпадку, калі ён не працуе некаторы перыяд часу і не плаціць за гэты перыяд адзіны падатак, атрымліваў права выплачваць за гэты перыяд узносы ў ФСАН на добраахвотных асновах. Па выніках пасяджэння было прынята рашэнне накіраваць гэтую прапанову ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны для разгляду і вярнуцца да яе абмеркавання на рабочай групе, пасяджэнне якой запланавана на канец жніўня — пачатак верасня. Там жа дадаткова разгледзяць і агучаныя на дзявятым пасяджэнні пытанні выплаты ІП бальнічных, дапамогі, звязаной з цяжарнасцю і доглядам за дзіцем.

Таксама на пасяджэнні рабочай групы закранулі моманты, звязаныя з набыццём і эксплуатацыяй электронных ключоў. Вырашана, што гэтыя пытанні Міністэрства эканомікі перададуць упаўнаважаным органам, а атрыманыя адказы — разашле ўдзельнікам групы.

Акрамя таго, Ірына Касцевіч паведаміла ўдзельнікам сустрэчы аб праектах нарматыўных прававых актаў, распрацоўка якіх ужо была ініцыявана групай. Так, дакумент, які памяншае меру адказнасці ІП за парушэнні тэхнічных рэгламентаў, зараз прыняты Нацыянальным сходам і накіраваны на подпіс кіраўніку дзяржавы. Што тычыцца сумеснай пастановы ўрада і Нацбанка аб парадку ўстаноўкі і выкарыстанні ІП плацежных тэрміналаў, то яна зараз дапрацоўваецца і ў найбліжэйшы час будзе ўнесена ва ўрад паўторна. Таксама Ірына Касцевіч папрасіла ўдзельнікаў групы дапамагчы скласці вычарпальны спіс формаў справаздачнасці, якія цяпер прыходзіцца прадстаўляць ІП у рамках іх узаемадзеяння з органамі ўлады.

«Мы працуем зараз над Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады, і там дакладна прапісана: скараціць усе магчымыя віды і формы справаздачнасці. Нам трэба з вашай дапамогай сур'ёзна рушыць наперад у гэтым пытанні», — заявіла намеснік міністра эканомікі.

Два наступныя пасяджэнні рабочай групы па прапанове прадпрымальнікаў вырашана прысвяціць узаемадзеянню ІП з мытнымі органамі і пытанням, якія ўзнікаюць у ходзе праверачнай дзейнасці Міністэрства па падатках і зборах.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# Са спіса «дармаедаў» выкрэсліваюцца...

**ДАВЕДКА.**

**Згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта № 3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» выплачваецца абавязак грамадзян Беларусі, якія пастаянна пражываюць у нашай краіне, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія не ўдзельнічалі ў фінансаванні дзяржаўных расходаў або ўдзельнічалі ў такім фінансаванні менш за 183 каляндарныя дні ў мінулым годзе, па выплаце збору ў памеры 20 базавых велічынь. Сёння такі падатак складае 420 рублёў (4,2 млн рублёў старымі).**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер наяўнасць прысядзібнага ўчастка вызваляе ад аплаты падатку толькі жыхароў сельскіх населеных пунктаў і пасёлкаў гарадскога тыпу, патлумачылі ў міністэрстве. Механізм такога вызвалення ў старой рэдакцыі дзейнічае наступным чынам. Калі грамадзяне 183 дні і больш у каляндарным годзе будуць зарэгістраваны ў сельскім населеным пункце або пасёлку гарадскога тыпу, пры гэтым яны вядуць асабістую падсобную гаспадарку на зямельным участку, прадастаўленым менавіта для гэтых мэт, то іх прызнаюць асобамі, якія ўдзельнічаюць у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў. У такім выпадку абавязак па выплаце збору ў іх адсутнічае.

Ірына Крываротшанка адзначыла, што змены ў выпадку іх прыняцця будуць распаўсюджваць сваю моц на праваадносіны, якія ўзнікл з 1 студзеня 2015 года. А гэта значыць, што калі дакумент уступіць у сілу пазней, чым неабходна будзе выплаціць падатак, то можна будзе вярнуць выплачаны збор.

### Астатніх падлічыць падатковая...

Сёння спецыялісты МПЗ адзначаюць, што больш за 4 тысячы беларусаў загадзя прызналіся ў сацыяльным утрыманстве, каб атрымаць 10-працэнтную зніжку на падатак. Такім людзям ужо налічылі 1 мільён 10 тысяч рублёў падатку. Самастойна гэта катэгорыя людзей магла паведаміць у падатковую інспекцыю да 31 мая аб тым, што яны нідзе не працавалі летась і не плацілі падаткаў, а аплаціць збор павінны былі не пазней за 1 ліпеня.

Цяпер падатковая служба да 1 жніўня павінна падрыхтаваць спіс тых, хто не заявіў пра сябе самастойна. Пакуль што няма нават папярэдніх ацэнак таго, колькі гэта будзе чалавек. Паводле слоў спецыяліста, да 15 ліпеня ўсе дзяржаўныя органы павінны падаць у падатковую службу інфармацыю пра беларусаў, якія ў 2015 годзе сапраўды ўдзельнічалі ў фінансаванні дзяржвыдаткаў. Гэта зробяць, каб выключыць работнікаў з ліку патэнцыйных плацельшчыкаў збору. Пасля гэтага спецыялісты МПЗ складуць спіс тых, хто ўдзельнічаў у фінансаванні дзяржвыдаткаў летась менш за 183 дні. Потым (прыкладна ў сярэдзіне жніўня) такім утрыманцам разашлюць лісты з паведамленнем пра аплату падатку.

### Падатковая прэзумпцыя невінаватасці

Спецыялісты падатковай галіны падкрэсліваюць, што не варта палохацца такога паведамлення. «Атрыманне падобнага дакумента не з'яўляецца 100-працэнтным пацвярджэннем, што трэба абавязкова плаціць падатак, — тлумачыць Ірына Крываротшанка. — У чалавека ёсць права патлумачыць жыццёвыя абставіны, якія складваліся ў яго ў 2015 годзе. Магчыма, у інспекцыі не мелі інфармацыі пра яго ўдзел у фінансаванні дзяржвыдаткаў».

Напрыклад, падатковыя службы не маюць поўнай інфармацыі пра нашых грамадзян, якія адправіліся на заробкі ў краіны ЕАЭС, а таксама аб усіх хатніх гаспадынях, якія выхоўваюць дзяцей да 7 гадоў (да 10 гадоў, згодна з праектам). Таму гэтым катэгорыям насельніцтва наша суразмоўца рэкамендуе паведаміць пра свае заняткі ў раённую падатковую інспекцыю, каб спрасціць працу падаткавікам і не атрымаць з-за недахопу інфармацыі ад інспекцыі паведамленне па ўплату збору. Акрамя таго, калі чалавек жыў у Беларусі, але пры гэтым працаваў аддалена на замежную кампанію і заплаціў у той краіне падаткі, то трэба прад'явіць пацвярджэнне гэтай аплаты. Яна пойдзе ў залік збору, і такі чалавек утрыманцам лічыцца ўжо не будзе.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

Сообщение о созыве очередного собрания акционеров ОАО «Проминвест»

**12 августа 2016 года в 16.00**
**СОСТОИТСЯ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «Проминвест»**
**по адресу: г. Минск, Логойский тракт, 31**
**магазин «Хозтовары-Мебель»**

**Повестка дня:**
1. Об итогах деятельности общества за 2015 г. Утверждение годового баланса.
2. О выплате дивидендов за 2015 год и распределение прибыли.
3. Утверждение новой редакции Устава
4. Избрание выборных органов.

**Начало регистрации: 15.30**

УНП 100646457

**ЗАСО «Промтрансинвест»**
**ПРЕДЛАГАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ЗАКУПКИ № 2016-358058,**
размещенной на сайте http://www.icetrade.by
**АУДИТОРСКИХ УСЛУГ ПО АУДИТУ ГОДОВОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ,** тел. (17) 222 75 49.

УНП 100357923